УДК 811.161.3’366:59.01/.08

# Словаўтваральныя тыпы беларускай навуковай фаўнанаменклатуры

***Грачыха Т.А.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Артыкул прысвечаны пытанням словаўтварэння сучаснай беларускай фаўністычнай наменклатуры ў параўнальным плане са словаўтварэннем на пачатковым этапе яе фарміравання ў 20-я гады ХХ стагоддзя.*

*Мэта – вызначыць у сінхранічным і дыяхранічным аспектах структурна-словаўтваральныя асаблівасці навуковых намінацый жывёльнага свету розных тэматычных груп.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам для даследавання паслужылі рода-відавыя намінацыі фаўны, змешчаныя ў сучасных энцыклапедычных і лексікаграфічных выданнях, а таксама тэрміналагічных слоўніках 20-х гадоў ХХ стагоддзя. У якасці асноўных метадаў аналізу выкарыстоўваліся апісальна-аналітычны і параўнальна-супастаўляльны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У працы вызначаны і даследаваны словаўтваральныя тыпы беларускай навуковай фаўнанаменклатуры на прыкладах рода-відавых намінацый звяроў, птушак, рыб, земнаводных і паўзуноў.*

*Разгледжаны такія асноўныя спосабы сінхранічнага ўтварэння вытворных фаўнаноменаў, як афіксацыя і складанне. Вызначаны адназоўнікавыя, аддзеяслоўныя, адпрыметнікавыя, адвыклічнікавыя тыпы, прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы і спосабы ўтварэння фаўнанаменклатуры.*

*Выяўлены ўплыў заалагічнай тэрміналогіі пачатковага этапу яе фарміравання на станаўленне сучаснай беларускай навуковай фаўнанаменклатуры.*

***Заключэнне.*** *Можна доказна канстатаваць, што ўтварэнне фаўністычных номенаў розных тэматычных груп адбываецца па агульных лексічных законах. На пачатковым этапе фарміравання беларускай навуковай фаўнанаменклатуры была характэрна арыентацыя на дыялектныя моўныя рэсурсы. Для сінхранічнага словаўтварэння сучаснай фаўнанаменклатуры характэрны спосаб афіксацыі, прычым, найбольш прадуктыўным з’яўляецца спосаб суфіксацыі, адзначана таксама асновасловаскладанне і асноваскладанне з суфіксацыяй, лексіка-семантычны і марфолага-сінтаксічны спосабы ўтварэння.*

***Ключавыя словы:*** *заалагічная тэрмінасістэма, фаўністычная наменклатура, словаўтварэнне, словаўтваральны тып, спосабы ўтварэння вытворных фаўнаноменаў, дэрыват, суфіксальны фармант, афіксацыя, складанне, субстантывацыя прыметнікаў.*

*(Ученые записки. – 2019. – Том 29. – С. 125–129)*

# Word Building Types of Belarusian Scientific Fauna Nomenclature

***Grachykha T.A.***
*Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*The article centers round issues of word building of the contemporary Belarusian fauna nomenclature in the comparative aspect with the word building at the initial stage of its shaping in the 20-s of the 20th century.*

*The purpose of the article is to identify in the synchronic and diachronic aspects structural and word building features of scientific nominations of the animal world of different thematic groups.*

***Material and methods.*** *The research material is genda and species fauna nominations which are placed in contemporary encyclodaedia and lexicographic publications as well as terminological dictionaties of the 20-s of the 20th century. The main analysis methods are the descriptive and analytical and the comparative.*

***Findings and their discussion.*** *Word building types of Belarusian scientific fauna nomenclature are singled out and studied on the examples of genda and species nominations of animals, birds, fish, amphibians and reptiles.*

*Such basic ways of synchrone building of faunamenes as affixation and composition are considered. Subsatntivation, formation from verbs, ajectives, interjection types are identified as well as productive and non-productive affixes and ways of building fauna nomenclature.*

*Influence of zoological terminology of the initial stage of its shaping on the maturation of the contemporary Belarusian scientific fauna nomenclature is identified.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: gta5963980@mail.ru –* ***Т.А. Грачыха***

***Conclusion.*** *We can quite definitely state that building fauna names of different thematic groups follows general lexical laws. At the initial stage of shaping Belarusian scientific fauna nomenclature aiming at dialect language resources was typical. For synchrone word building of the contemporary fauna nomenclature the way of affixation is characteristic; at the same time, the most productive is the way of suffixation. Root composition and root composition with suffixation, the lexical and semantic and the morphology and syntactic ways of word building are also pointed out.*

***Key words:*** *zoological terminology system, fauna nomenclature, word building, word building type, ways of building created faunamenes, derivative, suffuxal formant, affixation, composition, subsatntivation of adjectives.*

*(Scientific notes. − 2019. − Vol. 29. − P. 125−129)*

Функцыянаванне і развіццё нацыянальнай мовы немагчыма без упарадкаванай і ўнармаванай навуковай тэрміналогіі і наменклатуры розных галін ведаў. У сувязі з гэтым праблемы тэрміналогіі з'яўляюцца актуальнымі ў сучасным мовазнаўстве і даследуюцца як лінгвістамі, так і спецыялістамі розных навуковых напрамкаў. Пытанні станаўлення, развіцця і функцыянавання беларускай тэрміналогіі даследавалі ў сваіх працах такія беларускія мовазнаўцы, як В.П. Красней, Л.А. Антанюк, А.І. Падлужны, В.К. Шчэрбін, Н.В. Лаўрыновіч і інш. Аднак і на сённяшні дзень беларускія тэрмінасістэмы, у тым ліку і заалагічная, з'яўляюцца недастаткова даследаванымі і ўнармаванымі. Рода-відавыя намінацыі розных тэматычных груп жывёльнага свету ўтвараюць фаўністычную наменклатуру, якая з'яўляецца састаўной часткай заалагічнай тэрмінасістэмы і лексіка-семантычнай падсістэмай сучаснай беларускай мовы. Даследаванне структурных і словаўтваральных сувязей паміж номенамі на розных этапах развіцця беларускай тэрміналогіі мае важнае значэнне для вырашэння праблем унармавання сучаснай заалагічнай тэрмінасістэмы.

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца вызначэнне структурна-словаўтваральных асаблівасцей намінацый жывёльнага свету розных тэматычных груп у сінхранічным і дыяхранічным аспектах, каб выявіць уплыў пачатковага этапу фарміравання заалагічнай тэрміналогіі на станаўленне сучаснай беларускай навуковай фаўнанаменклатуры.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі рода-відавыя намінацыі фаўны, змешчаныя ў сучасных энцыклапедычных і лексікаграфічных выданнях, а таксама тэрміналагічных слоўніках 20-х гадоў XX стагоддзя. У якасці асноўных метадаў аналізу выкарыстоўваліся апісальна-аналітычны і параўнальна-супастаўляльны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Асноўнай адзінкай класіфікацыі словаўтваральнай сістэмы з'яўляецца словаўтваральны тып – структурна-семантычны ўзор, схема ўтварэння новых слоў, якая пры гэтым характарызуецца агульнасцю часціны мовы ўтваральнага слова, фарманта, словаўтваральнага значэння. Фаўністычныя номены матывуюцца часцей назоўнікамі, у меншай ступені – дзеясловамі, прыметнікамі, выклічнікамі ці гукапераймальнымі словамі.

Афіксацыя і складанне – асноўныя спосабы сінхранічнага ўтварэння вытворных фаўнаноменаў. Часцей за ўсё дэрываты ўтвораны шляхам афіксацыі, у першую чаргу, спосабам суфіксацыі.

<u>Суфіксальны фармант **-к** (а).</u>

Адназоўнікавыя ўтварэнні са значэннем 'назвы птушак': *камен**к**а, соў**к**а*-сплюшка, *піскуль**к**а*. Адпрыметнікавыя тыпы са значэннем 'назвы птушак': *стракат**к**а, малінаў**к**а*; *мядзян**к**а* 'назва паўзуна'. Аддзеяслоўныя ўтварэнні са значэннем 'назвы птушак': *перасмеш**к**а, перапёл**к**а*. Аддзеяслоўнае ўтварэнне гукапераймальнага характару: *крач**к**а* 'назва птушкі'.

У словаўтваральнай сістэме сучаснай фаўнанаменклатуры фармант **-к** (а) з'яўляецца пашыраным. У 20-я гады ён таксама ўдзельнічаў у словаўтварэнні. Напрыклад, адназоўнікавыя ўтварэнні, якія абазначаюць назвы птушак: *канар**к**а, нор**к**а*; адпрыметнікавыя тыпы: *стракат**к**а* 'назва птушкі'; *калюч**к**а* 'назва рыбы'; аддзеяслоўныя: *рыбал**к**а, рыбач**к**а* 'назвы птушак' [1].

<u>Суфікс **-ок.**</u>

Адназоўнікавыя ўтварэнні: *шуляч**ок**,* сокал-*каршач**ок*** 'назвы птушак', *кажан**ок*** 'назва млекакормячага'. Адвыклічнікавыя ўтварэнні са значэннем 'назвы птушак': *чыр**ок***-свістунок, *чыр**ок***-траскунок.

Прадстаўленыя дэрывацыйныя тыпы непрадуктыўныя. Параўн. з фаўнанаменклатурай 20-х гадоў, напрыклад, назвы птушак: адназоўнікавае ўтварэнне *шуляч**ок**,* аддзеяслоўнае ўтварэнне *ныр**ок*** [1].

<u>Суфікс **-ак (-як).**</u>

Адпрыметнікавыя ўтварэнні са значэннем 'назвы птушак': *пухл**як**, зімн**як***; 'назвы звяроў': заяц-*бял**як***, заяц-*русак;* 'назва рыбы': *гарч**ак***.

Суфікс **-ак (-як)** сустракаецца ў розных лексіка-семантычных групах фаўны. Параўн. з найменнямі 20-х гадоў, напрыклад, адназоўніка-

вае ўтварэнне *самяк* ‘назва рыбы’, адвыклічнікавае ўтварэнне дроп-*дудак* ‘назва птушкі’ [1].

Суфіксальны фармант **-ан/к** (а), **-ян/к** (а).

Адназоўнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назвы птушак’: *валасян/ка, заран/ка, крыжан/ка, канаплян/ка, беражан/ка, прасян/ка, аўсян/ка, чарацян/ка, берасцян/ка, пясчан/ка*; са значэннем ‘назва земнаводнага’: *жарлянка*. Некаторыя з прыведзеных найменняў можна разглядаць як утварэнні з множнай матывацыяй: матываваныя назоўнікам або прыметнікам. Адпрыметнікавае ўтварэнне: *быстранка* ‘назва рыбы’.

Для назваў арнітафаўны адназоўнікавы дэрывацыйны тып з’яўляецца прадуктыўным. Параўн. з найменнямі 20-х гадоў, напрыклад, адназоўнікавыя ўтварэнні: *глінян/ка* – ‘назва птушкі’; *вушан/ка* ‘назва млекакормячага’; *жарлян/ка* ‘назва земнаводнага’ [1]. Для намінацыі *глінянка* характэрна двайная матывацыя: магчымасць утварэння ад назоўніка або ад прыметніка.

Суфікс **-нік.**

Адназоўнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назвы птушак’: *траўнік, рабіннік*, *пясочнік*, ястраб-*перапёлачнік*, ястраб-*цецяроўнік;* ‘назвы млекакормячых’: *вячэрнік, жытнік*; ‘назва рыбы’: бычок-*пясочнік*. Лексемы *жытнік, вячэрнік* маюць таксама і другую матывацыю: могуць матывавацца прыметнікам. Адвыклічнікавае ўтварэнне: *дзербнік* ‘назва птушкі’.

Адназоўнікавы дэрывацыйны тып з’яўляецца прадуктыўным для найменняў птушак. Параўн. адназоўнікавыя ўтварэнні 20-х гадоў са значэннем ‘назвы птушак’: *чаромашнік*, дроп *цецяручнік*, *курат/нік* [1].

Суфікс **-ік (-ык).**

Адназоўнікавае ўтварэнне *сычык* ‘назва віда птушкі’. Адпрыметнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назвы відаў птушак’: крыжадзюб-*сасновік,* крыжадзюб-*яловік*; ‘назва млекакормячага’ заяц-*лазовік*’.

Дадзеныя дэрывацыйныя тыпы не вызначаюцца прадуктыўнасцю. Словаўтваральны суфікс -ік (-ык) служыць для ўтварэння асобных відаў жывёл.

Суфіксальны фармант **-ушк** (а),**-юшк** (а).

Адназоўнікавае ўтварэнне са значэннем ‘назвы птушак’: *амялушка*; аддзеяслоўнае – соўка-*сплюшка;* адпрыметнікавае – *чарнушка;* адвыклічнікавае – *ціркушка*.

Параўн. з найменнямі птушак 20-х гадоў: *амялушка*, нырок *чарнушка* [1].

Суфікс **-унок.**

Аддзеяслоўнае ўтварэнне са значэннем ‘назвы птушак’: *паўзунок*, чырок-*свістунок*, чырок-*траскунок*.

Параўн. рус. чирок-*свистунок,* чирок-*трескунок* [2].

Суфіксальны фармант **-аўк** (а), **-оўк** (а), **-ёўк** (а).

Адназоўнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назвы птушак’: *арэхаўка*, *сітаўка*; са значэннем ‘назва рыбы’: *вярхоўка*; са значэннем ‘назвы млекакормячых’: *мышоўка, палёўка*. У намінацыях *вярхоўка, палёўка* назіраецца двайная матывацыя: іх можна разглядаць і як адпрыметнікавыя ўтварэнні, вылучаючы пры гэтым інтэрфікс -оў- (-ёў). Аддзеяслоўнае ўтварэнне: *шчыпоўка* ‘назва рыбы’. Аддзеяслоўныя ўтварэнні гукапераймальнага характару са значэннем ‘назвы птушак’: *туркаўка*, пеначка-*цянькоўка*, *кнігаўка.*

Параўн. з номенамі 20-х гадоў: адназоўнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назвы птушак’: *тынаўка*, *чаротаўка, сітаўка, арэхаўка* [1]; *бярозаўка, жалудаўка, гарэхаўка* [3]. Аддзеяслоўнае гукаперамальнага характару: *кугакаўка* ‘назва птушкі’. Адназоўнікавы тып з суфіксам -аўк- быў прадуктыўны ў 20-я гады пры ўтварэнні намінацый птушак, чаго нельга сказаць пра сучасную арнітанаменклатуру.

Суфікс **-ец (-ець, -эц).**

Адпрыметнікавыя ўтварэнні са значэннем ‘назва птушак’: *глушэц, чэрнець*; са значэннем ‘назвы рыб’: *галец, сінец*. Адназоўнікавае ўтварэнне: *рыбец* ‘назва рыбы’.

Параўн. у 20-я гады: адпрыметнікавае ўтварэнне *глушэц* ‘назва птушкі’.

Суфіксальны фармант **-іц** (а), **-ыц** (а).

Адназоўнікавыя ўтварэнні: *ласіца* ‘назва млекакормячага’; *вераценніца* ‘назва паўзуна’. Адпрыметнікавыя ўтварэнні: *блакітніца* ‘назва птушкі’; *начніца, вячэрніца* ‘назвы млекакормячых (кажаноў)’; *часночніца* ‘назва земнаводнага’. Для намінацый *начніца, вячэрніца* магчыма двайная матывацыя: іх можна разглядаць і як адназоўнікавыя ўтварэнні з суфіксам -ніц-.

Параўн. у 20-я гады, напрыклад, адназоўнікавыя ўтварэнні: *верацяніца* ‘назва паўзуна’; *норыца* ‘назва млекакормячага’; адпрыметнікавыя ўтварэнні: *блакітніца, валасяніца* ‘назвы птушак’. Для намінацыі *валасяніца* магчыма двайная матывацыя: яе можна разглядаць і як адназоўнікавае ўтварэнне з вылучэннем інтэрфікса -ян-.

Суфіксальны фармант **-ніц** (а).

Адназоўнікавы тып са значэннем ‘назва птушкі’: *чаротніца.*

Параўн. адназоўнікавыя ўтварэнні 20-х гадоў:

*шчытніца, акулярніца* ‘назвы паўзуноў’ [1].

Суфіксальны фармант **-ух** (а).

Аддзеяслоўны тып са значэннем ‘назва птушак’: *пішчуха, рагатуха*, *сіпуха.* Аддзеяслоўны са значэннем ‘назва млекакормячага’: вавёрка-*палятуха*. Адпрыметнікавы са значэннем ‘назва птушкі’: *лысуха.*

У 20-я гады фармант -ух (а) быў непрадуктыўны: *лысуха* [1].

Суфікс **-ун.**

Аддзеяслоўныя ўтварэнні са значэннем ‘назвы птушак’: лебедзь-*клікун*, лебедзь-*шыпун,* арол-*крыкун, цвыркун*. Найменне *цвыркун* можна разглядаць як аддзеяслоўнае ўтварэнне гукаперaймальнага характару.

Параўн. аддзеяслоўныя ўтварэнні 20-х гадоў: *сысуны, плывуны* [1]. Магчыма, дадзеныя намінацыі з’яўляюцца запазычаннямі з рускай мовы. Параўн. рус. *черныш, пеночка-трещётка, ёрш-носарь* [2; 4].

У 20-я гады сустракаліся словаўтваральныя тыпы, якія не адзначаны ў сучаснай беларускай навуковай фаўнанаменклатуры. Адназоўнікавае ўтварэнне са значэннем ‘назва птушкі’ з суфіксам **-юх**: *канюх*. Адпрыметнікавае ўтварэнне са значэннем ‘назва рыбы’ з фармантам **-ізн (а)**: *бялізна*. Адназоўнікавае ўтварэнне са значэннем ‘назва паўзуна’ з фармантам **-ак-** (а): *вужака* [1]. Дадзеныя намінацыі прыйшлі ў наменклатуру 20-х гадоў з дыялектнай мовы. Гэтыя словаўтваральныя тыпы захаваліся ў сучасным народным словаўтварэнні.

Найбольш распаўсюджанымі словаўтваральнымі фармантамі з’яўляюцца -к (а), -анк (-а), -янк (а), -нік, -аўк (а), -оўк (а), -ёўк (а). Малапрадуктыўныя словаўтваральныя морфы: -ушк- (-юшк-), -ец (-эц, -ац), -ніц-, -іц- (-ыц-), -ух, -ун.

Пры словаўтваральным аналізе зоанаменклатуры як 20-х гадоў, так і нашага часу ўзнікаюць выпадкі, калі адну і тую ж вытворную лексему можна аднесці адразу да двух словаўтваральных тыпаў, што можна растлумачыць структурна-семантычнай характарыстыкай зыходнага слова. Напрыклад, намінацыі *начніца, вячэрніца* значэннем і структурай суадносяцца з асновамі прыметнікаў (начны, вячэрні), а таксама і з асновамі назоўнікаў (ноч, вечар), утвараючы два словаўтваральныя тыпы: з суфіксамі -іц- і -ніц-.

Як бачым, з вытворных номенаў найбольш характэрнымі з’яўляюцца адсубстантыўныя суфіксальныя ўтварэнні, аднак пашыраны адпрыметнікавыя і аддзеяслоўныя. Словаўтваральны ланцужок “гукаперайманне – дзеяслоў – назва” дазваляе аднесці адзначаныя ўтварэнні да аддзеяслоўных з указаннем іх гукаперaймальнага характару: цвырк-цвырк – цвыркаць – *цвыркун*; кра-кра – кракаць – *крачка* і інш.

Для ўтварэння навуковай фаўністычнай наменклатуры прэфіксальны спосаб непрадуктыўны: ***пад**ворлік* ‘назва птушкі’ [2]. Не з’яўляецца тыповым прэфіксальна-суфіксальны спосаб утварэння: ***па**морнік, **по**паўзень, **па**дарожнік* ‘назвы птушак’: ***пад**камен**шчык*** ‘назва рыбы’ [2; 4]. Параўн. з арнітаномeнамі 20-х гадоў: ***пад**ластаўка* [1], ***пад**каменка, **пад**салавей* [3] – прэфіксальны спосаб; ***пад**карыш/нік* [3] – прэфіксальна-суфіксальны.

Складаныя зоаномены, утвораныя спосабамі асновасловаскладання і асноваскладання з суфіксацыяй, матывуюцца словазлучэннямі. Для гэтых номенаў характэрны наступныя структурныя схемы ўтварэння.

Асновасловаскладаннем па схеме “аснова прыметніка + назоўнік” утвораны намінацыі са значэннем ‘назвы птушак’: *сів**а**грак, сів**а**варонка, чырван**а**ножка*; са значэннем ‘назва рыбы’: *бел**а**вочка;* са значэннем ‘назвы звяроў’: *шырак**а**вушка* [2].

Параўн. з арнітанаменклатурай слоўнікаў 20-х гадоў: *сів**а**грак, зялён**а**ножка*, *чорн**а**грудка, сін**я**шыйка, бел**а**соўка* [1], *сів**а**варонка, гал**а**хвосцік* [3]. Суфіксы **-к, -ік** уносяць памяншальнасць у дадзены тып словаўтварэння. У 20-я гады сустракаліся і іншыя словаўтваральныя тыпы, напрыклад, з базавым дзеясловам: *круц**і**галоўка* [1], *крут**а**галоўка* [3]; з базавым назоўнікам: *шыл**а**нос, шыл**а**хвосцік* [3].

Асноваскладаннем з суфіксацыяй (у тым ліку і з нулявой суфікацыяй) па схеме “аснова прыметніка + аснова назоўніка” ўтвораны намінацыі са значэннем ‘назвы птушак’: *чырв**а**накрыл, чырвон**а**валл**ёв/ік** (чырвонаваллёв**ік**), чорн**а**валл**ёв/ік** (чорнаваллёв**ік**), бел**а**бров**ік** (белабров**ік**)*; са значэннем ‘назвы рыб’: *верх**а**водка, крас**на**пёрка, таўст**а**лоб**ік** (таўсталоб**ік**)* са значэннем ‘назва млекакормячага’: *белазубка* [2]. Па схеме “аснова назоўніка + аснова дзеяслова” ўтвораны найменні са значэннем ‘назвы птушак’: *гар**ы**хвостка, ка**за**дой, рэп**а**лоў, пчал**а**ед, зме**я**ед, мыш**а**лоў, мух**а**лоўка, зім**а**род**ак***; са значэннем ‘назва млекакормячага’: *бур**а**зубка* [2]. Па схеме “аснова назоўніка + аснова назоўніка” ўтвораны номены са значэннем ‘назвы птушак’: *шыл**а**хвостка, крыж**а**дзюб*. Сярод утварэнняў пашыраным з’яўляецца асноваскладанне з нулявой суфіксацыяй і суфіксам -к-.

Параўн. з зоанаменклатурай слоўнікаў 20-х гадоў: найменні, утвораныя па схеме “асно-

ва прыметніка + аснова назоўніка” са значэннем ‘назвы птушак’: *рудахвостка, чорнакрылка, белагорлік, чырвонакрыл, тоўстадзюб.* Па схеме “аснова назоўніка + аснова дзеяслова” ўтвораны лексемы са значэннем ‘назвы птушак’: *зімарадак, пчалаедка, падлаед, мышалоў*; са значэннем ‘назвы звяроў’: *землярыйка, мясажэры* ‘драпежныя’. Па схеме “аснова назоўніка + аснова назоўніка” ўтвораны найменні: *качкадзюб* ‘назва звера’, *крыжадзюб* ‘назва птушкі’, *вадаземнікі* ‘земнаводныя’ [1; 3].

Найменне *бясцер* ‘назва рыбы’ (бялуга + сцерлядзь) з’яўляецца адзінай складовай абрэвіяцыяй сучаснай фаўністычнай наменклатуры.

Марфолага-сінтаксічны спосаб утварэння не характэрны для рода-відавой фаўнанаменклатуры, але ўласцівы вышэйшым сістэматычным катэгорыям таксонаў, сярод якіх адзначаецца субстантывацыя прыметнікаў: *вераб’інападобныя, гусепадобныя, валасянкавыя, цвыркуновыя, дваякадыхаючыя, земнаводныя, карпападобныя, зайцападобныя, млекакормячыя, парнакапытныя, плацэнтарныя* і інш. [2; 4]. Параўн. з таксонамі 20-х гадоў: *калючапёрыя, бязьмесцаплодныя, суставаногія, плечаногія, грэбнягрудыя, пустарогія, храсткапёрыя, плаўняногія* [1].

Усе складаныя намінацыі фаўны з’яўляюцца матываванымі, у тым ліку і новаўтварэнні, у асноўным калькі з рускай мовы: *чырвонаваллёвік, чорнаваллёвік, чырвананожка, чырванакрыл* і інш. [2; 4].

Да матываваных найменняў, якія маюць семантычны характар матывацыі і ўтвораны на аснове пераасэнсавання лексіка-семантычным спосабам, трэба аднесці невялікую колькасць метафарычных найменняў (іх 16), што ўзніклі ў выніку моўнай аманіміі і полісеміі. Так, намінацыі *бычок*-пясочнік ‘рыба’, чарацянка-*барсучок, валавока*, *кулік*-верабей, *кулік*-сарока, *бугай* вялікі (*бугай* малы), *конік* лугавы ‘птушкі’ ўзніклі ў выніку метафарычнага пераносу назваў жывёл на адзначаных прадстаўнікоў фаўны па пэўнай прыкмеце падабенства. Назвы *пастушок, каралёк, перавозчык, сявец, перасмешка, казадой, лоцманчык, шчогаль, падарожнік* лапландскі ‘назвы птушак’; *нетапыр-**карлік**, **соня** лясная (**соня** вялікая)* ‘назвы звяроў’ [2; 4] утвораны ў выніку пераасэнсавання назваў асоб па прыкмеце падабенства.

Параўн. з фаўнанаменклатурай 20-х гадоў: бакас *баранчык, іванчык, будаўнічок, каролік* і інш. ‘назвы птушак’; *бычок звычайны* ‘рыба падкаменшчык’ [1]. У некаторых выпадках працэс метафарызацыі ўскладнены суфіксацыяй: *барсуч**ок**, лоцман**чык**, будаўніч**ок*** і інш. Памяншальна-ласкальныя суфіксы **-ік-, -ок-, -чык** з’яўляюцца дэсемантызаванымі.

**Заключэнне.** Такім чынам, утварэнне фаўністычных номенаў розных тэматычных груп адбываецца па агульных лексічных законах. На пачатковым этапе фарміравання беларускай навуковай фаўнанаменклатуры была характэрна арыентацыя на дыялектныя моўныя рэсурсы. Пра гэта вядомы айчынны мовазнавец П.У. Сцяцко пісаў: “Сістэма афіксальнага субстантыўнага словаўтварэння беларускіх народных гаворак мае ў цэлым агульнабеларускую аснову. Народна-дыялектнай мове ўвогуле ўласцівы тыя ж дэрывацыйныя рысы і заканамернасці, што і літаратурнай” [5, с. 277]. Некаторыя дыялектныя фаўністычныя найменні ўліліся ў сучасную зоанаменклатуру і сталі агульналітаратурнымі. Для сінхранічнага словаўтварэння сучаснай фаўнанаменклатуры характэрны спосаб афіксацыі, прычым, найбольш прадуктыўным з’яўляецца спосаб суфіксацыі, вызначаны таксама асновасловаскладанне і асноваскладанне з суфіксацыяй, лексіка-семантычны і марфолага-сінтаксічны спосабы ўтварэння.

## Літаратура


1. Беларуская навуковая тэрмінолёгія / Ін-т беларус. культуры. – Менск, 1927. – Вып. 12: Назвы жывёл. – 71 с.
2. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск: БелСЭ, 1983–1986.
3. Ластоўскі, В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / В. Ластоўскі. – Коўна: Др. А. Бака, 1924. – Факсім. выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 832 с.
4. Радкевич, В.А. Биологическая терминология и номенклатура: Словарь русско-белорусско-латинский, белорусско-русский / В.А. Радкевич, Л.М. Вардомацкий, А.А. Лешко; лингв. ред. Н.В. Бирилло. – Минск: Выш. шк., 1993. – 479 с.
5. Сцяцко, П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне. Афіксальныя назоўнікі / П.У. Сцяцко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 320 с.


*Паступіў у рэдакцыю 15.02.2019 г.*